# МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў НАВЕЛЕ “ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ” У. КАРАТКЕВІЧА

***Сіманковіч А.В.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт

Агульнавядома, што ў сусветнай літаратуры аўтары актыўна практыкуюць уключэнне ў аповед міфалагічных вобразаў альбо адпаведных матываў. Не выключэнне ў гэтай з’яве і беларуская літаратура. Разам з агульнавядомымі міфалагічнымі персанажамі часцей за ўсё ўводзяцца і беларускія фальклорныя вобразы. Да такіх персанажаў ў свой час звярталіся многія беларускія паэты і пісьменнікі (М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі, М. Танк і інш.) [1].

Актуальнасць нашага навуковага даследавання звязана з неабходнасцю шырокага міжгаліновага вывучэння мастацкага свету Уладзіміра Караткевіча, што дазволіць больш канцэптуальна асэнсаваць самабытную мастацкую прастору твораў айчыннага класіка.

Мэта артыкула — на прыкладзе “Ладдзі Роспачы” раскрыць пісьменніцкую трактоўку класічных міфалагічных вобразаў і паказаць іх ідэйную канфрантацыю з рэалістычнымі персанажамі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам нашага даследавання з’яўляецца навела “Ладдзя Роспачы” У. Караткевіча. Для навуковага аналізу мастацкага тэксту былі выкарастаны прыёмы параўнальнага, дыскрэптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як вядома, У. Караткевіч актыўна ўводзіў у свой твор вобразы міфалагічных істот: Арахна, Харон, лемуры, Смерць. Для таго, каб зразумець іх адметнасць, варта разгледзіць кожны вобраз больш падрабязна.

Арахна (згодна з грэчаскімі міфамі) — гэта першапачаткова дзяўчына, якой не было роўных ва ўсім свеце ў ткацкім мастацтве. Аднойчы яна вырашыла паспаборнічаць у гэтай справе з багіняй Афінай Паладай. У выніку Арахна была пакарана за перабольшванне сваіх магчымасцяў і ўзвышэнне сябе да багоў: “З таго часу вісіць павук-Арахна ў сваёй павуціне і вечна тчэ яе” [2, с. 41]. Вобраз Арахны-павука істотна развіваецца ў творы Караткевіча. Яна з’яўляецца адной са слуг Смерці. У навеле Арахна выступае ў якасці істоты, якая адбірае фізічнае існаванне чалавека: “Яна [Арахна] вып’е з цябе жыццё і памяць” [2, с. 145]. Такім чынам, ва ўяўленні пісьменніка адзначаны міфалагічны персанаж падаецца не як вобраз звычайнага павука, а як увасабленне ката, які знішчае жыццё чалавека.

Харон (у навеле Шолах) — агульнавядомы вобраз перавозчыка душ праз рэкі Стыкс, Ахерон або Лету у падземным царстве. Асобная ўвага ў творы надаецца апісанню вачэй Перавозчыка. У міфалогіі імя Харон само па сабе перакладаецца, як “чалавек, які валодае вострым позіркам”. Вочы ў яго звычайна жорсткія, ліхаманкавыя і бліскучыя. Апісанне, якое сустракаецца ў Караткевіча: “Выліваха зірнуў на Перавозчыка і ўбачыў, што той слухае яго напружана, а вочы... Вачэй не было. На іх месцы пушыста расла белая плесня. Перавозчыку былі непатрэбныя вочы. Як крату” [2, с. 132]. З развіццём падзей ў творы ў Перавозчыка з’яўляюцца вочы: “І Выліваха ўбачыў, што з-пад плесні на вачніцах Перавозчыка пакаціліся раптам слёзы. Яны, відаць, былі вельмі пякучыя, бо спалілі і знішчылі плесню. І з-пад яе з’явіліся раптам вочы, спалоханыя жудаснай веліччу гэтага ржавага мора. Сінія” [2, с. 134]. Трэба адзначыць, што Перавозчык адзіны ў судны дзень трапіў у лапы Арахны, аддаўшы свае гады жыцця іншаму. Ён прагнуў забыцця, таму смерць была ўратаваннем ад шматгадовых пакут сумлення, таму Шолах ахвяраваў атрыманымі гадамі жыцця: “У наступнае імгненне ён знік. Знік, быццам яго і не было. Пачуўся яшчэ толькі шолах, нібы вызвалены ўздых” [2, с. 161].

Лемуры — гэта міфічныя істоты, род прывідаў, зданняў, якія ноччу ходзяць, будзяць і пужаюць жывых людзей, па словах Апулея, — гэта душы памерлых. Лемурамі маглі станавіцца забітыя людзі, памерлыя ад цяжкіх хвароб, а таксама злачынцы. У навеле лемуры таксама, як і папярэднія адзначаныя героі — служкі Смерці. У іх ёсць своеасаблівая іерархія, бо выдзяляецца лемур-канцлер, які раздае загады іншым. Лемуры ў творы выступаюць сродкам сувязі паміж Смерцю і яшчэ жывымі людзьмі. Як бачна з тэксту, злыя істоты баяцца спеваў людзей і святла. Гэтым скарыстаўся Гервасій Выліваха і абараніў усіх кветкай шыпшыны: "Сарваў з грудзей зыркую, як жарынка, кветку шыпшыны і пачаў вадзіць ёю вакол сябе" [2, с. 142]. І пачвары адступілі. Эпізод з лемурамі яшчэ раз звяртае ўвагу чытачоў на ўсеагульную думку, што жыццё перамагае ўсё.

Вобраз Смерці падаецца як вобраз жанчыны, якая кіруе ўсімі міфічнымі істотамі. Яна не сустракаецца ў грэчаскай міфалогіі, але ў інтэпрэтацыі Уладзіміра Караткевіча з'яўляецца галоўнай менавіта над класічнымі міфічнымі персанажамі. Светапогляд Смерці будуецца на нянавісці да чалавечага роду. Таму яна са сваёй "світай" знішчае яго. Але Смерць няпэўна ставіцца да беларусаў, бо яны валодаюць такой вялікай прагай жыцця і любоўю да зямлі, што нават найвышэйшая сіла не мае над імі поўнай улады. Смерць не верыць, што чалавецтва можна выправіць і зрабіць з яго нешта маральнае, карыснае, якаснае. У творы Смерць гуляе з чалавекам у шахматы, і стаўкай з'яўляецца жыццё. У выніку дзвюх спроб Гервасій перамагае.

**Заключэнне.** Міфалагічныя вобразы ўводзяцца У. Караткевічам для больш відавочнага паказу канцэптуальнага супрацьстаяння Дабра і Зла, Жыцця і Смерці. Носьбіты Зла і Смерці – гэта Арахна, Харон (Шолах), лемуры, а светлы пачатак аўтар звязваў з вобразамі беларусаў, найперш з народным правадыром Гервасіем Вылівахам. Такім чынам, пісьменнік у сваім творы пазіцыянуе беларусаў як сваю ўлюбёную нацыю, якая спрадвек нясе ў свеце неспатольную вітальную ідэю.

1. Крикливец, Е. В. Рецепция фольклорно-мифологических традиций в прозе русских и белорусских писателей второй половины XX века / Е. В. Крикливец // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXI (68) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 11-12 февраля 2016 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 131-133. – URL: https: // rep.vsu.by/handle/123456789/7758 (дата обращения: 15.03.2023).

2. Караткевіч, У. Сівая легенда. Ладдзя Роспачы. Цыганскі кароль / У. Караткевіч. – Мінск : Папуры, 2018. – 240 с.

3. Кун, Н. Легенды и мифы Древней Греции / Н. Кун. — СПб. : Азбука-Аттикус, 2021. — 544 с. — (Мировая классика).

## ФУНКЦИИ ЗООМЕТАФОРЫ В ТЕКСТЕ АНГЛОЯЗЫЧНОЙ ПРЕССЫ

***Соловьева И.А.,***
*студентка 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Турковская Е.В., канд. пед. наук, доцент

Изучение человеком животного мира на всем протяжении истории привело к тому, что характерные черты тех или иных видов закрепились в качестве стереотипов в культурном коде общества. Эти стереотипы нашли отражение в зоометафорах, которые можно обнаружить в разнообразных дискурсах, в т.ч. в медиадискурсе. Актуальность исследования обусловлена недостаточным описанием функций зоометафоры в англоязычной прессе.

Цель исследования – выявить функции зоометафоры в языке английской прессы.

**Материалы и методы.** Материалом исследования послужили зоометафорические выражения, представленные в англоязычных газетах (Entrepreneur [3, 4], The Spectator [5]) за 2022 г. Исследование проводилось при помощи дефиниционного и компонентного анализа, а также описательного и контекстуального методов.

**Результаты и их обсуждение.** В современной лингвистике существует ряд классификаций, описывающих функции метафоры и зоометафоры. Наиболее подробную и